Сэ ля ві і Віцебск

Спадчына Сігізмунда Юркоўска



"Смаленскі рынак" (друкуецца ўпершыню).



Каміла Жазэфіна Палькоўская, сястра жонкі С.Юркоўскага (друкуецца ўпершыню).

Фатаграфічная калекцыя Віцебскага абласнога краязнаўчага музея складаецца з больш чым 23 000 дакументаў. Гэта фатаграфіі самай рознай тэматыкі, у тым ліку дарэвалюцыйнага Віцебска і Віцебскага краю, ваеннага і пасляваеннага перыядаў XX стагоддзя. Але перлінай збору, без сумневу, можна лічыць 32 здымкі слыннага майстра Сігізмунда Юркоўскага. Фотамайстар, вынаходнік шторна-шчылінnага затвора, член фатаграфічнага аддзела Рускага тэхнічнага таварыства, ён захаваў на сваіх адбітках горад над Дзвіной напрыканцы XIX стагоддзя — ажыўленым, узнёслым, сапраўды губернскім, адметным, нібыта разумеючы, што Віцебск аднойчы зменіцца назаўжды і такім, як раней, ніколі ўжо не будзе...





"Уваскрэсенская царква".

Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Вольга Давідоўская. — У Санкт-Пецярбургу ён вучыўся ў Медыка-хірургічнай акадэміі, але спыніў вучобу і пераключыўся на фатаграфію. Нават быў вучнем знакамітага пецярбургскага майстра А.Дэньера. Цікава, што паслужыла да гэтага штуршком? Пэўны час Юркоўскі жыў у Магілёве, працуючы на дзяржаўнай службе. Мы таксама можам спытаць: чаму? І што ж потым здарылася, што прымусіла яго зноў пераехаць? Гэтым разам — у Віцебск, дзе Юркоўскі і раскрываецца як таленавіты майстар і актыўны падзвіжнік фатаграфіі. Магчыма, і сам горад прыцягнуў гэтую постаць?

Як бы там ні было, але, набыўшы ў 1867 годзе ўласнае фотаатэлье на вуліцы Замкавай, Сігізмунд Антонавіч з цягам часу становіцца адным з самых папулярных фотамайстроў. Да яго ідуць, як кажуць, і простыя гараджане, і цвет грамадства. Да прыкладу, вядома, што кліентам Юркоўскага быў славуты архітэктар Ціхан Кібардзін, які ў тыя часы ствараў аблічча цэнтра Віцебска. Таксама майстар быў знаёмы і з Іллём Рэпіным: бываў у знакамітага жывапісца ў яго маёнтку Здраўнёва, зрабіў там некалькі партрэтаў мастака.

Юркоўскі не толькі імкнуўся быць майстрам ва ўласна мастацтве вырабу фатаграфіі, але і аддаваў належнае, пасучаснаму кажучы, дызайну сваіх работ, адзначае Вольга Давідоўская. Тут ужо гаворка ідзе амаль пра стварэнне фірмовага знака: паспарту, што атачалі яго фатаграфіі, былі аздоблены графічнай выявай рамкі, нібыта падвешанай на цвік. Гэтая "няхітрая", але прыемная візуальная дэталь вылучала-такі работы Юркоўскага сярод іншых твораў віцебскіх фотамайстроў.

У цэлым, фатаграфічнае жыццё губернскага Віцебска ў тыя часы нельга назваць аднастайным. Па ўсёй Расійскай імперыі ствараліся адмысловыя аб'яднанні, таварыствы, вакол фатаграфіі гуртаваліся яе прыхільнікі, і не дзіва, што падобны гурток, членам якога з'яўляўся Юркоўскі, ды не толькі ён, існаваў і ў Віцебску. Зарабіць фатаграфіяй, праўда, удавалася не ўсім — у 1860 — 70-я гг. фотаатэлье ў сярэднім "вытрымлівалі" два-тры гады, — але рост цікавасці да фатаграфіі як да асобнай практыкі, якая пачала знаходзіць новыя спосабы свайго выкарыстання, быў навідавоку.

І тут мы падыходзім да яшчэ аднаго, найцікавейшага, факта ў біяграфіі беларускага фатографа — ягонага вынаходніцтва прататыпа сучаснага шторна-шчылінnага затвора. Паглыбіўшыся ў фотасправу, Юркоўскі вырашыў удасканаліць тагачасную фотатэхніку. Яго новы механізм дазволіў, па сутнасці, рабіць фотамайстрам імгненныя здымкі, не страчваючы ў якасці. І гэта аказаўся сапраўды значны крок для тых часоў.

Вынаходніцтва Юркоўскага, несумненна, выклікала цікавасць — ён быў фігурай аўтарытэтнай, — і затвор прадэманстравалі ў Маскоўскім політэхнічным музеі і на З'ездзе Рускага тэхнічнага таварыства ў 1882 годзе. Далейшыя ўдасканаленні свайго механізма Сігізмунд Юркоўскі ўжо падрабязна апісаў у санкт-пецярбургскім часопісе "Фатограф-аматар". Відавочнае прызнанне, тым не менш, не прывяло да прамысловага выпуску механізмаў у Расіі. І, не дачакаўшыся станоўчага адказу ад сваіх, Юркоўскі пагаджаецца на выпуск фотаапаратаў (з тым самым удасканаленнем) спачатку ў Германіі, а потым — у Англіі. Сэ ля ві: фотаапарат з затворам Юркоўскага першай у свет выпусціла нямецкая фірма "Герыз", а затым англійская — "Торнтон-Пікара".

Ды ўсё ж... Ад славутага майстра і нам дасталася ўнікальная спадчына — яго здымкі. Не ўдалося б Сігізмунду Юркоўскаму зрабіць сваё вынаходніцтва — не ўбачылі га — ва ўменні аўтара быць толькі сузіральнікам, але ткай таго, што ён фатаг шчырае захапленне ным абліччам Віцебска. віта таму, мне падаецца, творцу, які родам з Укр атрымаў адукацыю ў Ра ўсё ж прылічаем да беларускай фатаграфіі.

І напрыканцы яшчэ маленькая сенсацыя. у Віцебскі абласны чы музей прыйшоў ліст ад сваякоў славутага Марына Праўдалюбава, з'яўляецца спадкаемцай тры жонкі Сігізмунда скага — Камілы Жазэ Палькоўскай, прыслала ўстанову здымкі з выявам тографа, ягоных дзяцей, самай сястры жонкі з пра пацвердзіць іх ідэнтычнасць мы з вялікай радасцю лі ў тым самым бараду мужчыну славутага скага! — распавядае Давідоўская. — Цяпер ф нашай установы, вядома дазволу Марыны Праў бавай, папоўніліся партр як самога фатографа, так сваякоў...

Гэтыя рарытэты супрацо кі музея ласкава прадаста для публікацыі нашаму данню.

Дар'я АМЯЛЬКО наш спецыяль карэспанд Мінск — Віцебск — Мін

P.S. *У бягучым го музей плануе выпус у свет новае выд не паштовак з выяв Віцебска С.Юркоўска якое папоўніцца раней публікаванымі творамі ма стра. А ў кастрычніку м адбыцца фотафестыва імя С.Юркоўскага з удзе сучасных аўтараў.*



Дзеці С.Юркоўскага Эдмунд і Вікторыя (друкуецца ўпершыню).